Стальмаховіч Ю.С., студ. гр. 450 ФІДК
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Бамбешка І.І.,
ст. выкладчык

# СТАНАЎЛЕННЕ МУЗЕЙНАЙ АДУКАЦЫІ Ў РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Актуальнасць вывучэння музейнай адукацыі абумоўлена, па-першае, зменамі ў сістэме вышэйшай адукацыі, а па-другое – павышэннем цікавасці да праблем музея.

Сучасная навука вызначае музейную адукацыю як сістэму арганізацыі музейнай справы, а таксама як сукупнасць атрыманых у працэсе навучання ведаў, навыкаў і ўменняў, неабходных для музейнай дзейнасці.

Рэтраперспектыўны аналіз музейнай адукацыі неаднаразова быў прадметам даследавання расійскіх вучоных (Н. І. Сяргеевай, С. І. Сотнікавай, А. А. Сундзіевай, А. І. Фраловым і іншымі). Іх публікацыі дэманструюць залежнасць музейнай адукацыі ад цэлага шэрага фактараў, сярод якіх можна вылучыць наступныя:

- дзяржаўны і палітычны лад грамадства, які з'яўляецца дамінуючым для вызначэння стратэгій адукацыі ў цэлым і музеязнаўчага ў прыватнасці;
- эканамічная сітуацыя ў краіне, якая з'яўляецца каталізатарам, ці тормазам у развіцці пэўных кірункаў вышэйшай адукацыі;
- узровень развіцця культуры і навукі [8].

Неабходнасць падрыхтоўкі музейнах кадраў у Расіі была асэнсавана ўжо ў канцы XIX – пачатку XX стст., адзначаных ростам колькасці музеяў і вялікай увагай да праблем захавання, вывучэння і папулярызацыі нацыянальнай культурнай спадчыны.

Да гэтага часу ўсе адукацыйныя праграмы рэалізоўваліся непасрэдна ў музеях і грунтаваліся менавіта на традыцыях. Буйныя музеі (Збройная палата,

Гістарычны музей, Трэццякоўская галерэя, Політэхнічны) ўжо ў першыя гады свайго існавання з’яўляліся школай падрыхтоўкі музейных спецыялістаў, у першую чаргу – музейных захавальнікаў. Такая сітуацыя з’яўляцца нармальнай для сённяшняга часу, калі музейныя супрацоўнікі ў большасці сваёй маюць профільную базавую адукацыю.

Першыя спробы падрыхтоўкі музейных спецыялістаў у Расіі адносяцца да пачатку XX ст.: у Маскоўскім археалагічным інстытуце прафесар С. П. Кузняцоў – этнограф, археолаг, даследчык культуры і побыту удмурцкага і марыйскага народаў – з 1907 г. пачынае чытаць курс “музеязнаўства”. Выразны музеязнаўчы накірунак насілі семінарскія заняткі па археалогіі і этнаграфіі.

Пасля падзей 1917 г. патрэба ў падрыхтаваных музейных кадрах рэзка ўзрасла, што было абумоўлена значным павелічэннем колькасці музеяў, асабліва рэгіянальных, эміграцыяй часткі музейных супрацоўнікаў, якія не прынялі савецкую ўладу. Акрамя таго музей актыўна ўключаецца ў сістэму сярэдняй адукацыі і падрыхтоўкі настаўнікаў [4, с. 9].

Пытанне падрыхтоўкі музейных супрацоўнікаў неаднаразова разглядалася вышэйшымі органамі дзяржаўнай улады, а таксама на пасяджэнні Усерасійскага музейнага з’езда ў Маскве ў 1930 г. Пастановай Наркамата асветы ад 1932 г. была ўстаноўлена наступная структура музейнай адукацыі:

1. Кароткатэрміновыя курсы музеязнаўча-краязнаўчых і спецыяльных тыпаў; 2. Музейныя тэхнікумы; 3. Музейныя і музейна-краязнаўчыя кафедры ў асобных педагагічных вышэйшых навучальных установах; 4. Курсы павышэння кваліфікацыі музейных супрацоўнікаў на працягу года; 5. Музейная аспірантура [7, с. 289].

Тым не менш у даваенны час цэласнай сістэмы музейнай адукацыі ў СССР стварыць не ўдалося. У 1920-я гг. рабіліся спробы скласці сістэму падрыхтоўкі музейных спецыялістаў у ВНУ. У Маскоўскім і Петраградскім універсітэтах працавалі кафедры музеязнаўства, мэтай якіх была падрыхтоўка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музейных кадраў у галіне профільнай дысцыпліны – мастацтвазнаўства і гісторыі. У структуры Наркамата асветы быў створаны Цэнтральны музейна-экскурсійны інстытут. Ён каардынаваў усю дзейнасць па арганізацыі экскурсій. У 1931 г. для падрыхтоўкі спецыялістаў-музеёлагаў у Маскоўскім інстытуце гісторыі і філасофіі адчыніліся краязнаўчыя і музеязнаўчыя аддзяленні, а ў Ленінградскім гісторыка-лінгвістычным інстытуце – краязнаўчае аддзяленне. Аднак у 1932 г. яны былі ліквідаваны, паколькі не адпавядалі профілю ВНУ [3, с. 205].

У 1934 г. у Маскве адкрыліся Вышэйшыя музейныя курсы – першая музейная навучальная ўстанова Расіі і былога СССР. Першы іх набор складаўся з 50 супрацоўнікаў краязнаўчых музеяў. Слухачы курсаў мелі розную адукацыю – ад пачатковай да няскончанай вышэйшай , што адмоўна ўплывала на якасць падрыхтоўкі спецыялістаў. Курсы былі разлічаны на два гады і мелі два цыклы – гістарычны і прыродазнаўчы. Акрамя агульнаадукацыйных дысцыплін на курсах чыталіся музеязнаўчыя дысцыпліны: “Пабудова краязнаўчага музея”, “Асновы пабудовы музейнай экспазіцыі”, “Мастацкае афармленне музейнай экспазіцыі”, “Гісторыя музейнай справы”, “Абсталяванне музейных будынкаў” [1, с. 101-102].

У 1937/38 навучальным годзе на курсах вучылася ўжо 130 чалавек. На завочнае аддзяленне было прынята 200 чалавек і тэрмін навучання падоўжаны да трох гадоў, аднак у 1938 г. курсы былі зачынены [7, с. 390].

У пасляваенны час да 1954 г. падрыхтоўка музейных кадраў здзяйснялася на кафедры Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта і ў аспірантуры Дзяржаўнага Гістарычнага музея. Пасля гэтага музеязнаўчая спецыялізацыя існавала ў выглядзе спецкурсаў, курсавых і дыпломных работ на гістарычных кафедрах некаторых універсітэтаў і ў інстытутах культуры [5, с. 150].

Сітуацыя пачала мяняцца ў другой палове XX ст. У сувязі з узрастаннем самастойнасці музеяў, павышэннем патрабаванняў да музейнага персаналу і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

станаўленнем музеязнаўства як навуковай і вучэбнай дысцыпліны павялічваецца значэнне музеязнаўчых ведаў. Таму ўжо ў канцы 1980-х гг. пачынаюць адкрывацца спецыяльнасці "музеязнаўства" ў расійскіх ВНУ [2, с. 12]. У 1988 г. была адкрыта спецыяльнасць "Музейная справа і ахова помнікаў" у Ленінградскім інстытуце культуры (зараз гэта Санкт-Пецярбургская акадэмія культуры і мастацтваў. У 1989 г. была створана кафедра ў Маскоўскім гісторыка-архіўным інстытуце ( з 1991 г. – Расійскі дзяржаўны гуманітарны універсітэт). Па спецыяльнасці "музеязнаўства" былі зацверджаны і распрацаваны прыкладныя тыповыя праграмы, канвентыруемыя з замежнымі сістэмамі падрыхтоўкі музейных спецыялістаў. У 1991 г. у Маскоўскім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў таксама была адкрыта кафедра музеязнаўства. З 1993 г. універсітэт (тады яшчэ не з'яўляўся акадэміяй) пачаў праводзіць набор на камерцыйнай аснове па музейным спецыяльнасцям, што значна павялічыла агульную колькасць слухачоў.

З 1991 г. вядомым гісторыкам культуры Л. В. Белавінскім заснавана кафедра музеязнаўства ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў з дзённай і завочнай формамі навучання. На кафедры арыентаваліся на вывучэнне гістарычных крыніцазнаўчых дысцыплін.

У 2004 г. адкрыта спецыяльнасць "музеязнаўства" у Санкт-Пецярбургскім дзяржаўным універсітэце на гістарычным і філасофскіх факультэтах [7. с. 390].

Такім чынам, можна канстатаваць, што за апошнія 20 год год у Расіі склалася сучасная сістэма падрыхтоўкі музейных спецыялістаў, пачаткі якой былі закладзены 100 гадоў назад, а то і раней. Сённяшняя сістэма падрыхтоўкі кадраў даволі гнуткая і патрабуе далейшай распрацоўкі: у залежнасці ад мэт і магчымасцей кожнага жадаючага атрымаць музеязнаўчую адукацыю на выбар прадстаўляецца шырокі спектр адукацыйных паслуг [6, с. 57].

Можна прагназаваць, што ў далейшым сістэма музеязнаўчай адукацыі будзе расці і развівацца даволі хуткімі тэмпамі: будзе ўзрастаць колькасць ВНУ,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія будуць прадугледжваць адукацыю па музеязнаўчым спецыяльнасцям, удасканальвацца і як мага лепей распрацоўвацца музейная праграма.

Літаратура:


1 Грицкевич, В.П. История музеев мира: учебн. пособие для студентов ист. фак. / В. П. Грицкевич, А. А. Гужаловский. – Мн.: БГУ, 2003. – 284 с.

2 Каулен, М.Е. Российский институт культурологии: Вопросы музейного музееведения и повышения квалификации / М. Е. Каулен // Исторические экспозиции регион. музеев в постсоциал. период / отв. ред. И. В. Чувилова. – СПб., 2009. – С. 218-227

3 Косова, И.М. Кафедра музейного дела и её роль в подготовке музейных кадров / И. М. Косова // Теория и практика музейного дела в России на рубеже XX-XXI веков: Сб. наун. трудов / Государственный Исторический музей. – М., 2001. – 184 с.

4 Косова, И.М. Музейные кадры нуждаются в системной подготовке / И. М. Косова // Музей. – 2007. – №1. – С. 12-16.

5 Разгон, А. Как готовить кадры специалистов / А. Разгон // Советский музей. – 1988. – №2. – С. 9

6 Сундиева, А Путь в музейную профессию в России и во Франции / А.Сундиева // Музей. – 2008. – №5. – С. 56-60

7 Фролов, А.И. Музееведческое образование / А. И. Фролов // Российская музейная энциклопедия: в 2 т. – М., 2001. – Т.1. – С. 289-390

Шляхтина, Л.М. Музееведческое образование: ретроспектива и перспектива / Л.М. Шляхтина // Музееведческое образование [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http // www.musobl.divo.ru/mus_lection. - *Дата доступа: 20.09.2009.*


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ